# Па законах камсамольскага жыцця

18 кастрычніка ў актавай зале галоўнага корпуса адбылася XIX агульнаўніверсітэцкая камсамольская канферэнцыя. Яна абмеркавала справаздачныя даклады камітэта камсамола ўніверсітэта (дакладчык Г. Рылюк) і рэвізійнай камісіі (старшыня—В. Смаргуноў).

У спрэчках выступілі сакратар партыйнага камітэта ўніверсітэта А. Я. Бураўскі, прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў, сакратар Мінскага прамысловага абласнога камітэта ЛКСМБ І. М. Пермякова, В. Самец (дэлегат філалагічнага факультэта), П. Салаў (дэлегат фізічнага факультэта), А. Збрыцкі (старшыня праўлення клуба БДУ), А. Ляпёхін (дэлегат фізічнага факультэта), Л. Маліноўскі (дэлегат біялагічнага факультэта), І. Акінчыц (дэлегат гістарычнага факультэта), О. Буланчыкава (дэлегат філалагічнага факультэта), В. Д. Лапцёнак (член партыйнага камітэта ўніверсітэта), В. Зіневіч (дэлегат геаграфічнага факультэта) і іншыя — усяго 16 чалавек.

Пасля абмеркавання справаздачных дакладаў канферэнцыя прыняла разгорнутую пастанову.

Канферэнцыя абрала новы камітэт камсамола з 25 чалавек, рэвізійную камісію з 9 чалавек і дэлегатаў на XI камсамольскую канферэнцыю Ленінскага раёна г. Мінска. На арганізацыйных пасяджэннях камітэта камсамола і рэвізійнай камісіі сакратаром камітэта быў абраны Георгій Рылюк, а старшынёй рэвізійнай камісіі Яўген Брыгадзір — студэнт 1 курса гістарычнага факультэта.

Дзевятнаццаць разоў за пасляваенныя гады ўніверсітэцкая камсамольская арганізацыя даручала сваім пасланцам на канферэнцыі абмеркаваць зробленае за год, выявіць хібы ў рабоце, вырашыць, як ліквідаваць недахопы, намеціць канкрэтны план дзеянняў на бліжэйшы год. Але кожны раз не толькі мінулае, сучаснае ці недалёкае будучае турбавала дэлегатаў. Ва ўсім — у раўнівым позірку ва ўчарашні дзень, у клопатах сённяшняга, у складанні планаў на заўтра — было відаць: гэта яшчэ некалькі цаглінак у велічны будынак нашай светлай будучыні — камунізма.

XIX універсітэцкая камсамольская канферэнцыя адбылася ў нядзелю, 18 кастрычніка. Можна не задумваючыся сказаць, што яна выканала тую ролю, якую павінна была выканаць: выпрацаваць кірунак у рабоце камсамольскай арганізацыі ўніверсітэта на бягучы навучальны год. І сакратар камітэта камсамола Георгій Рылюк у справаздачным дакладзе, і дэлегаты канферэнцыі ў выступленнях вельмі выразна падкрэслівалі адну думку: як мага больш працаваць з камсамольскімі групамі, як мага больш працаваць з кожным членам арганізацыі.

Універсітэцкі камсамольскі калектыў налічвае ў сваіх радах 4100 чалавек. Лічба ўнушальная. Зразумела, вельмі складана весці работу ў такім калектыве. Тут і 1200 камсамольцаў фізфака і ў пяць разоў менш камсамольцаў гістфака; тут і факультэцкія арганізацыі, дзе дзевяць з кожных дзесяці — студэнты, і арганізацыі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і падрыхтоўчага факультэта, дзе студэнтаў увогуле няма. І ўсё ж з такім калектывам працаваць лёгка, бо аб'ядноўвае ён у сваіх радах тых, хто носіць гордае імя члена Камуністычнага Саюза моладзі.

Статут ВЛКСМ абавязвае кожнага камсамольца быць для ўсіх прыкладам у працы і вучобе, у павышэнні прадукцыйнасці працы і авалоданні тэхнікай, у барацьбе за ўсё новае і прагрэсіўнае, у строгім захаванні працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны, у памнажэнні грамадскай і сацыялістычнай маёмасці—асновы магутнасці і працвітання Савецкай Радзімы. Статут ВЛКСМ абавязвае кожнага камсамольца актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці народа, растлумачваць моладзі палітыку Камуністычнай партыі, паказваць прыклад у выкананні свайго грамадскага абавязку, настойліва авалодваць асновамі марксісцка-ленінскай навукі, ведамі, культурай. Статут ВЛКСМ абавязвае кожнага камсамольца весці рашучую барацьбу з усімі праявамі буржуазнай ідэалогіі, з дармаедствам, хуліганствам, п'янствам, рэлігійнымі і іншымі перажыткамі ў свядомасці людзей.

Здавалася б, няма асаблівай патрэбы паўтараць гэта лішні раз, бо пераважная большасць камсамольцаў выдатна ведае свае абавязкі, выконвае іх і гэтым садзейнічае выкананню тых задач, што стаяць перад Камуністычнай партыяй і савецкім народам у будаўніцтве камунізма. Але, на жаль, сярод камсамольцаў універсітэта ёсць яшчэ невялікая частка тых, хто так ці інакш парушае патрабаванні Статута ВЛКСМ.

Давайце прааналізуем некаторыя факты. Галоўны абавязак пераважнай большасці камсамольцаў вышэйшай навучальнай установы — паспяховае авалоданне ведамі, імкненне да таго, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. І вось перад намі лічбы. З 4037 студэнтаў універсітэта (а сярод іх — пераважная большасць камсамольцаў), якія здавалі экзамены ў летнюю сесію мінулага навучальнага года, 294 атрымалі нездавальняючыя адзнакі, а 2352 — добрыя і здавальняючыя. Гэта значыць, што 294 чалавекі дарэмна патрацілі цэлы год часу, а значная частка студэнтаў працавала не ў поўную сілу. Зразумела, што здавальняючую адзнаку не вельмі цяжка атрымаць, хоць яна і сведчыць аб станоўчых ведах.

Дзе прычына такой вялікай непаспяховасці? Каб уявіць сабе гэтую лічбу — 294, успомнім, што на кожным з такіх факультэтаў, як біялагічны, гістарычны, юрыдычны, геаграфічны, вучыцца прыкладна столькі студэнтаў. І вось прычына непаспяховасці: недастатковая ўвага да вучобы студэнтаў з боку камсамольскай арганізацыі. Не будзе перабольшваннем, калі мы скажам, што вялікая праца з мастацкай самадзейнасцю, народнай дружынай, факультэтам грамадскіх прафесій, спартыўнымі секцыямі і г. д. патрабуе вельмі многа сіл і энергіі, адцягвае ўвагу камітэта камсамола. Камітэт многа ўвагі ўдзяляе гэтым пытанням. І гэта неабходна. У той жа час ён недастаткова займаецца пытаннямі вучобы.

Безумоўна, мы не супраць удзелу студэнта, камсамольца ў грамадскай рабоце, у грамадскім жыцці ўніверсітэта. Але галоўнае патрабаванне да гэтага — вучоба не павінна адкладвацца на другі план. Паглядзім, як праходзяць камсамольскія сходы ў некаторых групах. Калі абмяркоўваецца пытанне, як правесці вечар адпачынку, то адразу ж разгараюцца гарачыя спрэчкі аб гэтым. Варта ж паставіць на парадак дня пытанне аб непаспяховасці таго ці іншага студэнта або аб пропусках заняткаў — актыўнасць камсамольцаў знікае. Вось тут і неабходна, каб у жыццё групы ўмяшаўся факультэцкі камітэт камсамола, каб ён растлумачыў яшчэ і яшчэ раз ісціну, што студэнт павінен перш за ўсё добра вучыцца.

І вельмі радуе, што на канферэнцыі ішла вялікая размова аб гэтым найпершым абавязку студэнта-камсамольца. Няма неабходнасці пералічваць факультэты і курсы, групы і асобных камсамольцаў, якіх дэлегаты горача крытыкавалі з трыбуны канферэнцыі. Важна тое, што амаль 800 дэлегатаў канферэнцыі разам шукалі шляхі да таго, як палепшыць паспяховасць студэнтаў. Шляхоў гэтых многа — кантроль за вучобай і наведваннем заняткаў кожным студэнтам, дапамога малодшакурснікам у набыцці навыкаў канспектавання лекцый, правільнай работы з кнігай і размеркавання свайго часу, высокая патрабавальнасць выкладчыкаў да студэнтаў і саміх студэнтаў да сябе і сваёй вучобы.

І толькі калі з вучобай усё ў парадку, пачынаецца другі бок студэнцкага жыцця: гурткі мастацкай самадзейнасці, студэнцкае навуковае таварыства, спорт. Удзел кожнага студэнта ў грамадскай працы павінен не перашкаджаць вучобе, а дапамагаць ёй, узбагачаць студэнта ведамі, рыхтаваць яго да самастойнай працы, да самастойнага жыцця.

Вось у такім напрамку і праходзіла работа канферэнцыі.

Вельмі важнай тэмай, якую таксама абмяркоўвалі дэлегаты канферэнцыі, было пытанне аб палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце. Яно пастаянна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі ўніверсітэта, якая працуе ў цесным кантакце і пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі. Формы і метады палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы прымяняліся самыя розныя. Чытанне лекцый і дакладаў, правядзенне палітінфармацый, гутарак у групах і ў інтэрнатах, экскурсіі на прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы рэспублікі, абмеркаванне кінафільмаў і тэатральных пастановак, дыспуты на кнігах, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці — усё гэта садзейнічала выхаванню студэнцкай моладзі. Немалое значэнне мае творчая садружнасць студэнтаў з ударнікамі і брыгадамі камуністычнай працы.

Гаворачы аб палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце. сёння нельга забывацца пра тое, што ў нашым жыцці сустракаюцца яшчэ факты амаральных учынкаў камсамольцаў. Рэктарат вымушан час ад часу выключаць такіх студэнтаў, у тым ліку і камсамольцаў, з універсітэта за п'янкі, хуліганства і г. д.

І хоць выпадкаў такіх не так ужо і шмат, задача камсамольскай арганізацыі — не дапускаць ніводнага амаральнага ўчынку, змагацца, каб кожны камсамолец, кожны студэнт ні на хвіліну не забываўся, што ён павінен ісці ў авангардзе савецкай моладзі.

Работа XIX камсамольскай канферэнцыі прайшла на высокім ідэйна-палітычным узроўні. І мы верым, што камсамольская арганізацыя выканае тыя задачы, якія стаяць перад ёю ў бягучым навучальным годзе, і да наступнай, XX канферэнцыі прыйдзе з новымі поспехамі.

**Я. ЛЯХАЎ.**

## За званне майстра

Учора пачаўся самы буйны за ўсю гісторыю ўніверсітэта турнір з нормай майстра спорту па рускіх шашках. У ім удзельнічаюць 8 запрошаных майстроў спорту (Плакхін, Файнберг, Берлінкоў, Бельскі, Прыяткін, Эльтэрман, Гардзевіч, Вярцінскі) і 8 мацнейшых універсітэцкіх шашыстаў — кандыдатаў у майстры. Пачатак спаборніцтваў штодзённа з 18 гадзін у фае 3-га паверху галоўнага корпуса. Турнір закончыцца 10 лістапада.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

**Ва ўніверсітэце працуюць два кіёскі — кніжны і перыядычных выданняў. Якой папулярнасцю яны карыстаюцца ў студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, можна меркаваць па здымку, які зроблен каля аднаго з іх — кіёска перыядычных выданняў.**



**У факультэцкіх камсамольскіх арганізацыях**

## Камітэт пачаў работу

Сваю практычную работу новы камітэт камсамола філфака пачаў з таго, што правёў семінар групкамсоргаў. На семінары былі абмеркаваны арганізацыйныя пытанні, заслуханы справаздачы групкамсоргаў. Выявілася, што некаторыя групкамсоргі недасканала ведаюць, як правільна весці ўнутрысаюзную работу, таму ў сваёй дзейнасці дапускаюць хібы.

З пытаннем аб задачах камсамольскай арганізацыі ў бягучым навучальным годзе выступіў дэкан факультэта Р. В. Булацкі. Члены камітэта камсамола, загадчыкі аддзелаў расказалі пра спецыфіку і напрамкі работы пазаштатных аддзелаў.

У заключэнне семінара яго ўдзельнікі наведалі Дзяржаўны мастацкі музей БССР.

**А. ЯРОХІН.**

**член камітэта камсамола БДУ, студэнт 1 курса аддз. журналістыкі.**

# Прыгоды Мякіша-Падмазоўскага

«Подхалим — льстивый попрошайка, пролаз, плут и лукавец».

*(Слоўнік Даля, стар. 214).*

**Калі ты, паважаны чытач, скажаш, што знаёмы з Мякішам-Падмазоўскім, мы не будзем з табою спрачацца, хоць сярод нас і няма чалавека з такім прозвішчам. І ўсё ж ён жывы і надзвычай жывучы. Яго мяккі, угодлівы голас не-не ды і праклюнецца ў голасе некаторых людзей, з якімі мы сустракаемся ў нашым штодзённым жыцці.**

**Падмазоўскі пад дотыкам і ціскам часу вельмі гнутка змяняе сваю форму, бо ён жа яшчэ і Мякіш. У нядаўнім мінулым ён ляпіў сябе пад густ уплывовай асобы. Цяпер жа яго аблічча стала куды больш рухомым: вымушан ляпіць сябе пад густ і пагляд калектыву. Жывецца яму нялёгка. Абшчыпаны Мякіш падсохнуў і змізарнеў, затое другая яго палавіна — Падмазоўскі — часта пазірае на нас падмасленымі анёльскімі вачыма.**

**Сёння мы раскажам пра некаторыя прыгоды Мякіша-Падмазоўскага. Калі ты, чытач, пазнаеш у ім свайго знаёмага, дай яму прачытаць гэты нумар нашай газеты.**

1.

З самага ранку Мякіш-Падмазоўскі быў незадаволены сабою. Чорт ведае што! Перад тым, як ісці здаваць экзамен самому Зубру Сілу Мілавічу, ён глянуў у люстэрка і ўбачыў там такую бяскрыўдную мордачку. На шчоках дрыжаў лёгкі цень разгубленасці, галава схілена крыху набок, вочы апушчаны. Калі яны крыху падымаліся, у іх нясмела, але выразна высвечваліся словы: «Вінават... Не дачытаў... Ваш прадмет такі складаны!» І рука сціскала лацкан, што бліжэй да сэрца. Калі той, хто глядзеў у люстэрка, нарэшце, з палёгкай уздыхнуўшы, падняў вочы і гатовы быў сказаць сам сабе: «Малайчына, выдатна», Мякіш-Падмазоўскі раптам уздрыгануўся. Які жах! На самай макушцы ёршыкам тырчалі валасы. Які жах! Можна падумаць, што ў яго ёсць нейкая якасць ярішыстасці. Тады трэба будзе рыхтавацца, выказваць сваю думку, а то—крый бог — яшчэ і спрачацца!.. Добра, што ў пакоі нікога няма. Хлопцы, склаўшы кнігі ў высокія роўныя слупы, пайшлі ўжо на экзамен. Падмазоўскі ўзяў з Янкавай тумбачкі пляшку з алеем, шчодра лінуў у жменю і перакуліў яе на макушцы. Затым шчыльна пацёр далонню, расчасаў валасы і глянуў у люстэрка. Стаяць, кудлы праклятыя! Яму нічога не заставалася, як разбіць яйка і аддзяліць бялок ад жаўтка.

На экзамене Мякіш-Падмазоўскі гаварыў, што з захапленнем чытаў працы Сілы Мілавіча (але, на жаль, іх нялёгка засвоіць), што вырашыў прысвяціць сваё жыццё (у будучым) прадмету Сілы Мілавіча, што гатовы стаць на калені перад тым, хто прысвяціў сябе такой усеабдымнай галіне навукі... А Сіла Мілавіч нешта незадаволена, але мякка бурчаў і ўсё пытаў, пытаў... Галава Мякіша ўгравалася, яму здавалася, што хутка закіпяць мазгі і ён апантана кінецца з пакою. Можа ўжо ў апошні раз ён крышку ўзвёў сухія пачырванелыя вочы і тут заўважыў, што Сіла Мілавіч утаропіўся на яго макушку. «Няўжо ўстыркліся, акаянныя?!» — мільганула думка. «Трэба было маргарынам. Цяпер — капут». Мякішу стала горача, горача...

Шырока расплюшчаныя вочы Сілы Мілавіча застылі. Гэты добры хлапчына сівеў на яго вачах. (Запякаўся бялок). Стары прафесар разгубіўся і вінавата сказаў:

— Вы нездаровы. Відаць, Выператаміліся ў час падрыхтоўкі. Працаваць трэба разумна. Беражыце сябе, беражыце, малады чалавек. Я Вам стаўлю тройку... Выправіцца здароўе — прыходзьце пераздаваць... Але галоўнае...

Яшчэ скрыпелі дзверы, а Мякіш таропка насоўваў шапку. Ён стомлена ўсміхнуўся аднакурснікам:

— Здаваць яму—адна асалода.

І сціпла пакрочыў на вуліцу. Там ён зняў шапку, высока ўзняў галаву: навакол толькі незнаёмыя. Ішоў паважна і нетаропліва. Нейкая высокая старая, абганяючы, яго, прашаптала:

— Такі малады, а галава ўжо, як снег.

Ён нічога не зразумеў. У гэты час ён думаў пра тое, што ён разумны, ведае меру і не патраціў маргарыну. Яшчэ спатрэбіцца.

**Іван КАЗАЧНІК.**

**Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.**

**Адрас рэдакцыі:**
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02460. Тыр. 2000. Зак. 3722.